# Прэзідыум ЦВК БССР—тав. ЧАРВЯКОВУ, СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР вітае працоўных Совецкай Беларусі ў дзень яе 15-годдзя. На аснове паслядоўнага правядзення нацыянальнай палітыкі Леніна-Сталіна і пры падтрыманні працоўных усяго СССР. Беларусьператварылася ў перадавую совецкую рэспубліку, дабіўшыся велізарных поспехаў у справе развіцця індустрыі і буйнага соцыялістычнага земляробства, у справе ўмацавання калгаснага ладу і ў справе павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўня працоўных мас. Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта ўпэўнен, што рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя Беларусі з новым уздымам будуць вырашаць найвялікшыя задачы другой пяцігодкі — пяцігодкі пабудовы бяскласавага соцыялістычнага грамадства і падымуць на новую ступень значэнне сваёй краіны.

Няхай жывуць рабочыя, калгаснікі і ўсе працоўныя БССР!

Няхай жыве моцны непарушны братні саюз усіх народаў Совецкага Саюза.

**ПРЭЗІДЫУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА СССР.**